УДК 392:273.2(476.5)

# АСАБЛІВАСЦІ РАССЯЛЕННЯ І ДЭМАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СТАРАВЕРАЎ ПАЎНОЧНА-ЎСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***У. Я. Аўсейчык***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт

*У артыкуле прааналізаваны асаблівасці рассялення і разгледжаны дэмаграфічныя працэсы ў стараверскага насельніцтва паўночна-ўсходняй Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. На аснове аналізу статыстычных матэрыялаў вылучаны асноўныя месцы пражывання старавераў на тэрыторыі рэгіёна, прасочана дынаміка іх колькасці, прааналізаваны суадносіны гарадскога і сельскага насельніцтва, вылучаны гарадскія цэнтры старавераў на тэрыторыі рэгіёна.*

**Ключавыя словы:** стараверы, паўночна-ўсходняя Беларусь, рассяленне, арэал, колькасць насельніцтва, стараверская абшчына, дэмаграфія, этналогія.

## Уводзіны

З сярэдзіны XVII ст. на тэрыторыі Беларусі побач з мясцовым насельніцтвам пражывае значная колькасць рускіх старавераў, якія эмігравалі сюды ў выніку рэформаў патрыярха Нікана. За больш чым трохсотгадовы перыяд пражывання на беларускіх землях перасяленцы-стараверы не толькі развілі сваю культуру, але і папоўнілі скарбонку культурнай спадчыны беларускай зямлі, аказалі ўплыў на развіццё мясцовага насельніцтва.

На тэрыторыі Беларусі стараверскае насельніцтва рассялілася ў трох асноўных зонах: паўднёва-ўсходняй, паўночна-заходняй і паўночна-ўсходняй. І калі ў навуковай літаратуры па першых двух яшчэ сустракаецца пэўная інфармацыя, то стараверы паўночна-ўсходніх зямель Беларусі даследаваны даволі павярхоўна. Між іншым гэты рэгіён з'яўляецца адным з ранніх арэалаў рассялення стараверскага насельніцтва на Беларусі. Мэта дадзенага артыкула – выявіць асаблівасці рассялення і дэмаграфічных працэсаў у старавераў паўночна-ўсходняй Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. У межах адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу другой паловы XIX – пачатку XX ст. у гэты рэгіён увайшлі наступныя тэрыторыі: беларускія землі ў складзе Віцебскай губерні, за выключэннем Дрысенскага павета (Віцебскі, Гарадоцкі, Лепельскі, Полацкі паветы); Сенненскі і Аршанскі паветы Магілёўскай губерні; Барысаўскі павет Мінскай губерні (малюнак).




**Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі і сумежных тэрыторый у другой палове XIX – пачатку XX ст.**

© Аўсейчык У. Я., 2021

Крыніцамі даследавання з’яўляецца комплекс статыстычных даных і матэрыялаў па стараверскаму насельніцтву ў вышэйпазначаных геаграфічных межах у другой палове XIX – пачатку XX ст. Асновай для працы сталі апублікаваныя даныя. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў даследчыкаў пастаянна ўзнікалі пытанні да дакладнасці статыстычных даных па стараверскаму насельніцтву як на беларускіх землях, так і на тэрыторыі суседніх краін [1, с. 99; 2, с. 271, с. 327–328; 3, с. 35]. Гэта абумоўлена складанасцю падлікаў з-за ізаляванага характару пражывання старавераў і мінімалізацыяй кантактаў з уладай і праваслаўнай царквой, спецыфікай міграцыйных працэсаў, а таксама з недасканаласцю саміх падлікаў.

## Асноўная частка

**Асаблівасці рассялення.** Большая частка тэрыторыі паўночна-ўсходняй Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. адміністрацыйна адносілася да Віцебскай губерні. У гэты перыяд губерня з’яўлялася лідарам па колькасці старавераў сярод іншых беларускіх губерняў. У табліцы 1 прадстаўлены даныя аб колькасці старавераў у Віцебскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Большасць старавераў Віцебскай губерні адносіліся да беспапоўскага толку. У рэгіёне пражывалі федасееўцы, філіпоўцы і паморцы. На тэрыторыі беларускіх паветаў жылі і старaверы-папоўцы веткаўскага сагласа. Большая частка папоўцаў пасяляецца ў рэгіёне пасля двух выгнанняў старавераў з Веткі і яе ваколіц, якія здзейснілі расійскія войскі ў 1735 г. і 1764 г. [4, с. 49; 5, с. 47–50; 6, с. 14–16].

**Табліца 1 – Дынаміка колькасці старавераў і аднаверцаў у Віцебскай губерні (1861–1906 гг.)**

| Год | 1861 | 1865 | 1882 | 1886 | 1893 | 1897 | 1902 | 1906 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць старавераў (чал.) | 37 027 | 45 830 | 69 180 | 72 863 | 84 675 | 83 022 | 99 081 | 108 955 |
| Колькасць аднаверцаў (чал.) | 3 615 | 3 117 | 3 697 | 4 357 | 5 402 | * | 6 888 | Не прыведзена |

* – па перапісе 1897 г. аднаверцы прадстаўлены разам з праваслаўнымі і асобна не вылучаны

[складзена аўтарам на аснове: 7, с. 613; 8, с. 293; 9, с. 169; 10, с. 173; 11, с. 193; 12, с. 74; 13, с. 95; 14, с. 49].

Тэрытарыяльна Віцебская губерня ўключала не толькі беларускія землі (у сучасных адміністрацыйных межах), але і сучасныя тэрыторыі Латвіі і Расіі. Як вынікае са статыстычных даных, асноўная частка старавераў Віцебскай губерні пражывала якраз не на беларускіх землях. Так, згодна з матэрыяламі перапісу 1897 г. у Віцебскай губерні налічвалася 83 022 старaверы. Пераважная большасць іх (60 642 чалавекі, што складае 73% ад агульнай колькасці) пражывала на тэрыторыі Рэжыцкага, Люцынскага і Дзвінскага паветаў (сучасная тэрыторыя Латвіі). Значная колькасць (9,5%) старавераў пражывала ў Веліжскім, Невельскім і Себежскім паветах, тэрыторыя якіх у сучасны перыяд адносіцца да Расійскай Федэрацыі. У той жа час на беларускія землі прыходзілася толькі каля 17,5% ад агульнай колькасці старавераў Віцебскай губерні. У табліцы 2 прадстаўлены даныя аб колькасці старавераў і аднаверцаў у беларускіх паветах Віцебскай губерні (г.зн. тэрыторыя якіх уваходзіць у сучасныя межы Беларусі).

**Табліца 2 – Размеркаванне старавераў і аднаверцаў па беларускіх паветах Віцебскай губерні (1861–1902 гг.)**

| Год | Колькасць старавераў у паветах Віцебскай губерні (чал.) | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Віцебскі | | Гарадоцкі | | Дрысенскі | | Лепельскі | | Полацкі | | Усяго | |
| | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы | Стараверы | Аднаверцы |
| **1861** | 1 412 | 322 | 225 | 115 | 268 | 17 | 367 | 13 | 2 141 | 1 157 | **4 413** | **1 594** |
| **1862** | 1 823 | 340 | - | 111 | 209 | 17 | 622 | 18 | 2 201 | 827 | **4 855** | **1 313** |
| **1863** | 2 040 | 520 | 208 | 114 | 218 | - | 611 | 16 | 3 753 | 295 | **6 830** | **945** |
| **1864** | 1 975 | 861 | 386 | 192 | 181 | - | 685 | - | 3 293 | 605 | **6 520** | **1 658** |
| **1865** | 2 167 | 813 | 427 | 163 | 256 | - | 812 | - | 3 626 | 455 | **7 288** | **1 431** |
| **1882** | 3 740 | 807 | 496 | 372 | 257 | - | 799 | - | 3 591 | 161 | **8 883** | **1 340** |
| **1883** | 3 956 | 832 | 413 | 380 | 262 | - | 791 | - | 3 522 | 226 | **8 944** | **1 438** |
| **1884** | 3 860 | 873 | 507 | 374 | 213 | - | 847 | - | 3 379 | 239 | **8 806** | **1 486** |
| **1885** | 3 794 | 913 | 515 | 421 | 263 | - | 828 | 5 | 3 467 | 409 | **8 867** | **1 748** |
| **1886** | 3 947 | 1011 | 507 | 413 | 262 | - | 741 | - | 3 713 | 252 | **9 170** | **1 676** |
| **1894** | 4 177 | 1 305 | 642 | 423 | 274 | 2 | 541 | 1 | 4 528 | 65 | **10 162** | **1 796** |
| **1897** | 6 622 | * | 734 | * | 373 | * | 844 | * | 5 953 | * | **14 526** | * |
| **1902** | 8 403 | 1 376 | 2 080 | 92 | 385 | - | 997 | - | 5 999 | 125 | **17 864** | **1 593** |

* – па перапісе 1897 г. аднаверцы прадстаўлены разам з праваслаўнымі і асобна не вылучаны

[складзена аўтарам на аснове: 7, с. 613; 8, с. 292–293; 9, с. 164–169; 10, с. 168–173; 12, с. 74; 13, с. 90–95]; 15, с. 202–204; 16, с. 282–283; 17, с. 166–167; 18, с. 162–167; 19, с. 162–167; 20, с. 158–163; 21, с. 85.

Як бачна з прыведзеных у табліцы 2 даных, лідарамі па колькасці старавераў у рэгіёне былі Віцебскі і Полацкі паветы. У іх пражывала звыш 80% ад усіх старавераў беларускай часткі Віцебскай губерні. Тут налічвалася каля паловы ўсіх прыхільнікаў "старой веры". Акрамя таго, у Віцебскім павеце налічвалася значная колькасць аднаверцаў. У Гарадоцкім і Лепельскім паветах старавераў налічвалася значна менш, чым у Віцебскім і Полацкім. Асноўная маса старавераў Лепельскага павета пражывала ў паўднёва-усходняй яго частцы (Гарадчэвіцкая, Цяпінская і Бачэйкаўская воласці) [22, с. 24]. У сучасны перыяд гэта тэрыторыя памежжа Лепельскага, Чашніцкага і Бешанковіцкага раёнаў. Напачатку XX ст. стараверы пражывалі ў 94 населеных пунктах Віцебскага, у 164 – Полацкага, у 26 – Гарадоцкага, у 31 – Лепельскага паветаў [1, с. 122]. У Дрысенскім павеце, як вынікае з даных, прадстаўленых у табліцы 2, старавераў пражывала мала.

Асноўныя цэнтры стараверства беларускіх паветаў Віцебскай губерні размяшчаліся на тэрыторыі сучасных Віцебскага, Шумілінскага, Полацкага, Бешанковіцкага і Чашніцкага раёнаў. У "Памятнай кніжцы" Віцебскай губерні на 1914 г. пералічаны 4 стараверскія абшчыны ў г. Віцебску (2 беспапоўскія і 2 папоўскія аўстрыйскага сагласу). У Віцебскім павеце налічвалася 6 абшчын: у в. Грышаны і в. Падлазнікі Мішкаўскай воласці, маёнтку Сумы Бабінічскай воласці, в. Краснаполлі Жарэбічскай воласці, маёнтку Увалокі Старасельскай воласці, Полцеўская абшчына (маёнтак Шуміліна). У Лепельскім павеце было 2 абшчыны: Балтурынская абшчына у м. Бешанковічы і федасееўская абшчына ў

в. Должыца Цяпінскай валасці. Адна абшчына старапаморскага сагласу існавала ў г. Полацку. Пяць абшчын налічвалася ў Полацкім павеце: у в. Шмана і Латкова Ловажскай валасці, в. Забор'е і в. Жалудова Міхалоўшчынскай валасці, в. Вялікія Жарцы Артэйкавіцкай валасці [23, с. LI–LVI].

Важным цэнтрам стараверства на беларускіх землях быў Барысаўскі павет Мінскай губерні. Асноўная маса старавераў Барысаўскага павета пражывала ў паўночнай яго частцы. У сучасны перыяд гэта тэрыторыя памежжа Барысаўскага, Крупскага і Чашніцкага раёнаў. Сярод цэнтраў стараверства ў гэтым рэгіёне з сярэдзіны XIX ст. вылучаліся засценак Бабарыкі і засценак Будзішча. У гэтых населеных пунктах існавалі і стараверскія малельні. Так, яшчэ этнограф Я. П. Тышкевіч паведамляў, што ў сярэдзіне XIX ст. староверы Барысаўскага павета былі аб'яднаны ў дзве абшчыны з цэнтрамі ў Бабарыках і Будзішчы. Па сведчанні этнографа, акрамя старавераў Барысаўскага павета, да іх належалі староверы суседніх Лепельскага, Сенненскага і Копысскага паветаў [24, s. 14–15].

**Табліца 3 – Дынаміка колькасці стараверскага насельніцтва Барысаўскага павета Мінскай губерні (1858–1913 гг.)**

| Год | 1858 | 1863 | 1871 | 1875 | 1880 | 1885 | 1890 | 1894 | 1897 | 1902 | 1907 | 1913 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць старавераў (чал.) | 1493 | 1509 | 1242 | 1459 | 2025 | 2555 | 2802 | 3182 | 4023 | 4157 | 4516 | 4872 |

[складзена аўтарам на аснове: 25, с. 22–29; 26, с. 10; 27, с. 232; 28, с. 93; 29, с. 14; 30, с. 13; 31, с. 3; 32, с. 3; 33, с. 78; 34, с. 78; 35, с. 104; 36, с. 72].

Істотная колькасць стараверскага насельніцтва налічвалася і ў паўночных паветах Магілёўскай губерні – Сенненскім і Аршанскім. Даныя аб колькасці старавераў у гэтых паветах прыведзены ў табліцы 4.

**Табліца 4 – Дынаміка колькасці стараверскага насельніцтва Сенненскага і Аршанскага паветаў Магілёўскай губерні (1858–1913 гг.)**

| Год | 1859 | 1861 | 1888 | 1893 | 1897 | 1900 | 1905 | 1910 | 1914 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Колькасць старавераў у Сенненскім павеце (чал.) | 1 064 | 1 071 | 3 111 | 3 433 | 4 605 | 4 383 | 4 983 | 5 117 | 6 019 |
| Колькасць старавераў у Аршанскім павеце (чал.) | 17 | 20 | 163 | 186 | 223 | 353 | 278 | 336 | 620 |

[складзена аўтарам на аснове: 37, с.14–22; 38, с. 72–73; 39, с. 72; 40, с. 386; 41, с. 94; 42, ведамасць № 16; 43, с. 148; 44, с. XVIII; 45, с. 46].

Колькасць старавераў у Аршанскім павеце да пачатку XX ст. заставалася нязначнай. У паўночнай частцы Магілёўскай губерні асноўная маса стараверскага насельніцтва адносілася да Сенненскага павета. Большая частка старавераў Сенненскага павета пражывала ў паўночнай яго частцы ў Астровенскай, Машканскай і Латыгаўскай валасцях (сучасная тэрыторыя Бешанковіцкага і Сенненскага раёнаў). Частка старавераў пражывала ў заходняй частцы павета (Лукомльскай, Лісічынскай і Бобрскай валасцях) на мяжы з Барысаўскім і Лепельскім паветамі [46, с. 104].

Трэба адзначыць, што ў паветах Магілёўскай губерні, якія знаходзіліся на поўдні ад Сенненскага і Аршанскага, старавераў пражывала мала. Амаль не налічвалася іх у Горацкім, Клімавіцкім, Мсціслаўскім паветах. Невялікая колькасць пражывала ў Быхаўскім і Чавусскім паветах. Толькі ў Магілёўскім павеце пражывала значная колькасць старавераў (972 чалавекі на 1897 г.) [37, с. 14–22; 38, с. 72–73; 39,

с. 72; 40, с. 386; 41, с. 94; 42, ведамасць № 16; 43, с. 148; 44, с. XVIII; 45, с. 46]. Такім чынам, Сенненскім і Аршанскім паветамі замыкаўся паўночна-ўсходні арэал рассялення старавераў на Беларусі.

**Дэмаграфічная характарыстыка.** Статыстычныя даныя, якія прадстаўлены ў табліцах 1-4, пераканаўча сведчаць аб устойлівым павелічэнні колькасці старавераў у паўночна-ўсходняй частцы Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Сур'ёзныя тэмпы росту стараверскага насельніцтва адзначаны ў беларускіх паветах Віцебскай губерні. Так, з 1861 г. па 1902 г. колькасць старавераў тут павялічылася ў чатыры разы (гл. табліцу 2). Найбольш значны рост назіраўся ў Віцебскім павеце. За гэты перыяд колькасць старавераў у ім вырасла ў шэсць разоў. Больш чым у шэсць разоў павялічылася агульная колькасць старавераў у Сенненскім і Аршанскім паветах у другой палове XIX – пачатку XX ст. (табліца 4). Амаль у 3 разы вырасла колькасць стараверскага насельніцтва ў Барысаўскім павеце (табліца 3).

Як вынікае з крыніц, павелічэнне колькасці стараверскага насельніцтва ў другой палове XIX – пачатку XX ст. на беларускіх землях абумоўлена некалькімі прычынамі. У большай ступені яно звязана з натуральным прыростам насельніцтва, які быў характэрны як для ўсёй Расійскай імперыі [47, с. 42–43, с. 47–48], так і для беларускіх зямель. Другая палова XIX – пачатак XX ст. характарызуецца хуткім ростам насельніцтва. Толькі за 1860–1890-я гг. насельніцтва Беларусі амаль падвоілася [48, с. 242].

На беларускіх землях павелічэнне стараверскага насельніцтва за кошт пераходу ў "раскол" мясцовага насельніцтва (пераважна праваслаўнага) не было распаўсюджанай з'явай. У той жа час далучэнне да стараверства праваслаўнага насельніцтва ў іншых частках Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. было досыць пашыраным [4, с. 96]. У афіцыйных публікацыях згадваліся выпадкі пераходу мясцовага беларускага насельніцтва ў стараверства, але адзначалася, што яны не мелі шырокага распаўсюджвання [49, с. 48]. Разам з тым з боку царкоўных і цывільных улад скіроўваліся захады па далучэнні старавераў да праваслаўнай царквы. Гэта ўвасобілася ў стварэнні т.зв. аднаверскай царквы. Далучэнне старавераў да праваслаўнай царквы на правах аднаверства найбольш шырокае распаўсюджанне атрымала якраз у Віленскай, Віцебскай і Ковенскай губернях [1, с. 138–142; 4, с. 96–97]. Як сведчаць статыстычныя даныя, колькасць аднаверцаў у рэгіёне была дастаткова значнай (гл. табліцы 1-2). У другой палове XIX – пачатку XX ст. намаганнямі царкоўных і цывільных улад частка старавераў пераходзіла ў праваслаўе. Але выпадкі пераходу з "расколу" ў праваслаўе не былі масавымі, а дзейнасць місіянераў, як сведчаць крыніцы, не прыносіла жаданых вынікаў [49, с. 47].

Рост колькасці стараверскага насельніцтва абумоўлены таксама паляпшэннем іх прававога статусу ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Указы ад 3 мая 1883 г. "О даровании раскольникам некоторых прав гражданских и по отправлению духовных треб" і 17 красавіка 1905 г. "Об укреплении начал веротерпимости" 1905 г. істотна палепшылі становішча старавераў. Немалаважнае значэнне ў росце колькасці старавераў у рэгіёне мелі захады царскага ўраду па русіфікацыі краю, асабліва пасля паўстання 1863 г. У рэгіёне ствараліся спрыяльныя ўмовы для перасялення сюды рускіх, у тым ліку і старавераў. Разам з тым імклівае павелічэнне колькасці старавераў, асабліва ў 1860–1870-я гг. можна патлумачыць і ўдасканаленнем іх падліку. Паколькі з-за ізаляванага ладу жыцця падлік стараверскага насельніцтва быў даволі ўмоўны, то вызначыць яго дакладную колькасць у сярэдзіне XIX ст. было праблематычна.

Асноўная колькасць стараверскага насельніцтва паўночна-ўсходняй Беларусі пражывала ў сельскай мясцовасці. Як вынікае з афіцыйных статыстычных даных, доля старавераў-гараджан у Віцебскай губерні ў 1862 г. складала 6%, у 1863 г. – 9,2%, у 1882 г. – 8,7%, у 1886 г. – 9,3%, у 1894 г. – 10,4%, у 1897 г. – 8,8% [7, с. 164–169; 8, с. 168–173; 10, с. 74; 13, с. 202–204; 14, с. 282–283; 19, с. 85]. А па даных на 1902 г. колькасць гарадскога насельніцтва вырасла да 18,8% [11, с. 90–95]. Пры гэтым трэба адзначыць, што доля старавераў у беларускіх гарадах губерні была невялікай. Большую частку стараверскага гарадскога насельніцтва губерні складалі старaверы Дзвінска і Рэжыцы. Старaверы ў беларускай частцы губерні пражывалі толькі ў Віцебску, Полацку і Гарадку. У той жа час яны амаль не пражывалі ў павятовых цэнтрах Лепелі і Дрысе (толькі па некаторых гадах тут налічвалася не больш за дзесяць старавераў).

Сярод гарадоў па колькасці стараверскага насельніцтва вылучаўся Віцебск. На працягу другой паловы XIX – пачатку XXI ст. у Віцебску пражывала большая частка стараверскага гарадскога насельніцтва беларускай

часткі Віцебскай губерні. У розныя гады тут пражывала ад 50% (1882 г.) да 80% (1902 г.) усяго гарадскога стараверскага насельніцтва беларускай часткі Віцебскай губерні. Так, у 1862 г. у г. Віцебску налічвалася 207 старавераў, у 1863 г. – 405, у 1882 г. – 404, у 1886 г. – 583, у 1894 г. – 684. А даныя перапісу 1897 г. засведчылі аб 1 465 старaверах у Віцебску. У 1902 г. у горадзе налічваўся 1 881 старавер, што склала каля 22,4% ад усёй колькасці старавераў Віцебскага павета. Другім горадам па колькасці старавераў быў Полацк. Тут у 1862 г. налічвалася 80 старавераў, у 1863 г. – 214, у 1882 – 356, у 1894 – 254, у 1897 г. – 350, у 1902 г. – 395. Такім чынам, на 1902 г. у Полацку пражывала каля 6,6% ад усёй колькасці старавераў Полацкага павета. Колькасць жа старавераў у Гарадку не была вялікай. У 1882 г. у горадзе налічвалася 43 чалавекі, у 1886 – 51, у 1894 г. – 41, у 1897 г. – 30, у 1902 г. – 84 [9, с. 164–169; 10, с. 168–173; 12, с. 74; 13, с. 90–95; 15, с. 202–204; 16, с. 282–283; 21, с. 85].

Асноўная маса старавераў Барысаўскага павета – таксама сельскія жыхары. Толькі ў горадзе Барысаве пражывала некаторая іх колькасць. Так, у 1858 г. у Барысаве налічвалася 39 старавераў, у 1863 г. – 49, у 1887 г. – 128 , у 1897 г. – 178, у 1912 г. – 232 [25, с. 10; 26, с. 10; 50, с. 262; 24, с. 78; 51, с.108].

У Сенненскім і Аршанскім паветах доля гарадскога стараверскага насельніцтва была зусім нязначнай. Нягледзячы на тое што Сенненскі павет быў адным з лідараў па колькасці старавераў у паўночна-ўсходняй частцы Беларусі, доля гарадскога насельніцтва была ў павеце невялікай. Як сведчаць статыстычныя даныя, у 1860-х – пачатку 1890-х гг. стараверы ў г. Сянно ўвогуле не пражывалі. Толькі ў сярэдзіне 1890-х гг. яны фіксуюцца ў горадзе. Так, у 1897 г. іх налічвалася 38 чалавек, 1900 г. – 19, у 1905 г. – 20, у 1910 г. – 20, у 1914 г. – 29. Колькасць старавераў у Оршы таксама была невялікай. У 1888 г. тут пражывала 14 старавераў, у 1893 г. – 13, у 1897 г. – 45, у 1900 г. – 37, у 1905 г. – 20, у 1910 г. – 19, у 1914 г. – 54 [38, с. 72–73; 39, с. 386; 40, с. 386; 41, с. 94; 42, с. 164; 43, с.148; 44, с. XVIII; 45, с. 46].

Такім чынам, сярод гарадскіх цэнтраў паўночна-ўсходняй Беларусі, дзе налічвалася значная колькасць старавераў, былі Віцебск, Полацк і Барысаў. Аднак, як сведчаць крыніцы, удзельная вага старавераў у структуры іх гарадскога насельніцтва была невялікай.

У другой палове XIX – пачатку XX ст. пераважная частка старавераў паўночна-ўсходняй Беларусі пражывала ў сельскай мясцовасці і працавала на зямлі. Але значная колькасць старавераў была занята адыходнымі промысламі. Асаблівасцямі міграцыйных працэсаў у старавераў рэгіёна ў адзначаны перыяд, абумоўленых спецыфікай гаспадарчай дзейнасці, можна патлумачыць і некаторую дыспрапорцыю гендарнага складу насельніцтва. Як сведчаць крыніцы, гендарны склад старавераў рэгіёна быў стабільным (з невялікай перавагай жаночага насельніцтва). Аднак па асобных гадах можна назіраць пэўную дыспрапорцыю ў колькасці мужчынскага і жаночага насельніцтва ў гарадах рэгіёна. Так, у 1886 г. у Віцебску налічвалася 583 старaверы, з іх 321 мужчына і 262 жанчыны. А ў 1902 г. даныя сведчаць аб 395 старaверах у Полацку, з якіх 231 мужчына і 164 жанчыны [10, с. 168–173; 13, с. 93].

**Заключэнне**

Такім чынам, у другой палове XIX – пачатку XX ст. у паўночна-ўсходняй частцы Беларусі пражывала значная колькасць стараверскага насельніцтва. Рэгіён з'яўляўся адным з важнейшых месцаў кампактнага пражывання старавераў на беларускіх землях. У межах рэгіёна стараверы пражывалі ў Полацкім, Віцебскім, Гарадоцкім, Сенненскім і Аршанскім паветах, а таксама ва ўсходняй частцы Лепельскага і паўночных землях Барысаўскага паветаў. У другой палове XIX – пачатку XX ст. назіраецца ўстойлівае павелічэнне стараверскага насельніцтва на тэрыторыі рэгіёна, што было абумоўлена ў першую чаргу натуральным ростам насельніцтва, а таксама паляпшэннем прававога статусу старавераў. Пераважная большасць стараверскага насельніцтва рэгіёна пражывала ў сельскай мясцовасці, доля гараджан сярод старавераў была невялікай. Асноўнымі гарадскімі цэнтрамі паўночна-ўсходняй часткі Беларусі, дзе налічвалася значная колькасць старавераў, былі Віцебск, Полацк і Барысаў.

***СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ***

1. ***Гарбацкі, А. А.*** Стараабраднiцтва на Беларусi ў канцы XVII – пачатку XX стст. / А. А. Гарбацкi. – Брэст : БрДУ, 1999. – 202 с.
2. ***Поташенко, Г.*** Староверие в Литве: Вторая половина XVII – начало XIX вв. Исследования, документы, материалы / Г. Поташенко. – Вильнюс : Aidai, 2006. – 543 с.
3. ***Заварина, А. А.*** Русское население восточной Латвии во второй половине XIX – начале XX века : Историко-этнографический очерк / А. А. Заварина. – Рига : Зинатне, 1986. – 246 с.

4. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В. В. Грыгор'ева [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.

5. ***Волков, В. И.*** Сведения о начале, распространении и разделении раскола и о расколе в Витебской губернии / В. И. Волков. – Витебск : Тип. губ. правл., 1866. – 21 + 85 с.

6. ***Сементовский, А.*** Этнографический обзор Витебской губернии / А. Сементовский. – СПб. : Тип. М. Хана, 1872. – 69 с.

7. Памятная книжка Витебской губернии на 1863 год. – Витебск: Тип. губ. правл., [б. г.]. – [1], 7, 642, 57 с.

8. Памятная книжка Витебской губернии на 1867 год. – СПб. : Тип. К. Вульфа, 1867. – VIII, 319, 118 с.

9. Памятная книжка Витебской губернии на 1884 год. – Витебск : Тип. губ. правл., 1884. – V, 329 с.

10. Памятная книжка Витебской губернии на 1888 год. – Витебск : Губ. тип., 1888. – V, 195, 118, XIV, 150, XIV с.

11. Памятная книжка Витебской губернии на 1895 год. – Витебск : Губ. тип., 1895. – [2], IV, VII, 31, 248, 59, XIV с.

12. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. / Изд. Центр. Стат. комитета М-ва вн. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Тип. т-ва "Народная польза". – [Вып.] 5 : Витебская губерния. – Тетрадь 3. – 1903. – [4], XIV, 283 с.

13. Памятная книжка Витебской губернии на 1904 год. – Витебск : Губ. типо-лит., 1903. – VIII, 32, 256, 119, 19 с.

14. Статистические сведения по Западно-Русскому краю // Литовские епархиальные ведомости. – 1908. – 1 января. – № 1. Приложение к "Вестнику Виленского православного Св.-Духовского братства". Календарь на 1908 високосный год. – С. 49–62.

15. Памятная книжка Витебской губернии на 1864 год. – СПб. : Тип. К. Вульфа, 1864. – VIII, 415 с.

16. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год. – СПб. : Тип. К. Вульфа, 1865. – VIII, 376, 128, 7 с.

17. Памятная книжка Витебской губернии на 1866 год. – СПб. : Тип. К. Вульфа, 1866. – VIII, 218, 144 с.

18. Памятная книжка Витебской губернии на 1885 год. – Витебск : Тип. губ. правл., 1885. – [2], IV, 375, 124, XX с.

19. Памятная книжка Витебской губернии на 1886 год. – Витебск : Тип. губ. правл., 1886. – [2], V, 171, 107, 63, XIX с.

20. Памятная книжка Витебской губернии на 1887 год. – Витебск : Тип. губ. правл., 1887. – [2], V, 174, [1], 107, 88, XXII с.

21. Памятная книжка Витебской губернии на 1898 год. – Витебск : Губ. тип., 1898. – [2], IV, 43, 138, 343 с.

22. ***Горбачевский, И. Д.*** Лепельский уезд Витебской губернии / И. Д. Горбачевский. – Витебск : Губ. тип., 1895. – 38 с.

23. Памятная книжка Витебской губернии на 1914 год. – Витебск : Губ. тип., 1914. – [2], VI, 280, LXX, 42 с.

24. ***Tyszkiewicz, E.*** Opisanie powiatu Borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim. Z dodatkiem wiadomości: o obyczajach, śpiewach, przysłowiach i ubiorach ludu, gusłach, zabobonach i t.d. / E. Tyszkiewicz. − Wilno : Drukarnia Ant. Marcinowskiego, 1847. − 489, IV s.

25. Памятная книжка Минской губернии на 1860 год. – Минск : Тип. губ. правл., 1859. – 155, 112 с.

26. Памятная книжка Минской губернии на 1865 год. – Минск : Губ. тип., 1864. – 234, 57 с.

27. Памятная книжка Минской губернии на 1873 год. – Минск : Губ. тип., 1872. – 293 с.

28. Обзор Минской губернии за 1875 год. – Минск : Губ. тип., 1876. – 160, [82] с. : табл.

29. Обзор Минской губернии за 1880 год. – Минск : Губ. тип., 1881. – [2], 38, [79] с. : табл.

30. Обзор Минской губернии за 1885 год. – Минск : Губ. тип., 1886. – [4], 30, [61] с. : табл.

31. Памятная книжка Минской губернии на 1892 год. – Минск : Губ. тип., 1891. – XLIV, 196, 168 с.

32. Памятная книжка Минской губернии на 1896 год. – Минск : Тип.-лит. Х. Дворжеца и Б. Соломонова, 1895. – XLIV, 294, 88, 26 с.

33. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитета М-ва вн. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Тип. С.-Петербургской тюрьмы. – [Вып.] 22 : Минская губерния. – 1904. – [4], XVI, 243 с.

34. Памятная книжка Минской губернии на 1904 год. – Минск : Тип.-лит. Б. И. Соломонова, 1903. – 221, 157, 68 с.

35. Памятная книжка Минской губернии на 1909 год. – Минск : Тип. С. А. Некрасова, 1908. – 208, 192 с.

36. Памятная книжка Минской губернии на 1915 год. – Минск : Губ. тип., 1914. – 232, 185, III с.

37. Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. – Могилев : Тип. губ. правл., 1861. – 18, 34, 106, 115, 144, 52, 8 с.

38. Памятная книжка Могилевской губернии на 1863 год. – Могилев : Тип. губ. правл., 1862. – 236, 106, XI с.

39. Памятная книжка Могилевской губернии на 1890 год. – Могилев : Тип. губ. правл., 1890. – 464 с.

40. Памятная книжка Могилевской губернии на 1895 год. – Могилев : Тип. губ. правл., 1890. – 467, LII с.

41. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центр. Стат. комитета М-ва вн. дел ; под ред. Н. А. Тройницкого. – СПб. : Тип. Спб. акц. общ. "Слово". – [Вып.] 23 : Могилевская губерния. – 1903. – [4], XVI, 276 с.

42. Памятная книжка Могилевской губернии на 1902 год. – Могилев : Тип. губ. правл., 1902. – XI, XXXVIII, 342, 104, 48 ведомостей, XXXVI с.

43. Памятная книжка Могилевской губернии на 1907 год. – Могилев : Тип. губ. правл., 1906. – 302, 151, V с.

44. Памятная книжка Могилевской губернии на 1912 год. – Могилев : Губ. тип., 1911. – 236, LXXXVI, 48 с.

45. Памятная книжка Могилевской губернии на 1916 год. – Могилев : Губ. тип., 1916. – XVI, 256, X, 69, 72 с.

46. ***Аникиевич, К. Т.*** Сенненский уезд Могилевской губернии / К. Т. Аникиевич. – Могилев : Могил. губ. стат. ком., 1907. – 148 с.

47. ***Рашин, А. Г.*** Население России за 100 лет (1811–1913 гг.). Статистические очерки / А. Г. Рашин. – Москва : Гос. стат. изд.-во, 1956. – 352 с.

48. ***Пірожнік, І. І.*** Насельніцтва Беларусі і дэмаграфічныя працэсы / І. І. Пірожнік // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск : БелЭн, 2000. – С. 242–251.

49. Обзор Витебской губернии за 1896 г. – Витебск : Губ. тип.-лит., 1897. – 127, 106 с.

50. Памятная книжка Минской губернии на 1889 год. – Минск : Губ. тип., 1888. – 349, III с.

51. Памятная книжка Минской губернии на 1914 год. – Минск : Губ. тип., 1913. – 240, 189, III с.

Паступіў у рэдакцыю 19.06.2020 г.
Кантакты: uladz39@tut.by
(Аўсейчык Уладзімір Яўгенавіч)

**Auseichyk U. SETTLEMENT AND DEMOGRAPHIC CHARACTERISTICS OF OLD BELIEVERS OF NORTHERN-EASTERN BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE XIX – EARLY XX CENTURIES.**

*In the article the features of settlement and demographic processes of Old Believers of the northern-eastern Belarus in the second half of the XIX century – the beginning of the XX century are considered. On the basis of the analysis of statistical materials the main places of Old Believers' residence on the territory of the region have been revealed, the dynamics of their number in separate administrative units has been traced, the correlation of urban and rural population has been analysed, the urban centres of Old Believers on the territory of the region have been pointed out.*

**Keywords:** Old Believers, northern-eastern Belarus, settlement, area, population number, Old Believers community, demography, ethnology.